Победу на выборах одержал Лула да Силва, что сопровождалось блокированием дорог сторонниками Болсонару. Первые часы действующий президент не комментировал результаты, но вскоре признал поражение.

Таким образом, президентские выборы в Бразилии показали существенное разделение общества по политическим, социальным и другим вопросам. Так как состояние мировой экономики сегодня достаточно сложное, это отражается и на отдельных государствах. Избрание Президентом Бразилии Лулы да Силва связано с надеждами на поддержку беднейших граждан и на рост социальных программ.

**Литература**

1. Выборы без правил в Бразилии: фаворит Лула против Болсонару. Удержится ли «бразильский Трамп»? [Электронный ресурс]. − Режим доступа: https://www.bbc.com/russian/features-63413942. − Дата доступа: 12.11.2022.

## Дзённікі падарожжа як частка мемуарнай спадчыны роду Радзівілаў

*Калтачэнка А. І., асп. РІВШ,*
*навук. кір. Любы А. У., канд. гіст. навук, дац.*

Сярод падданых Вялікага Княства Літоўскага (далей – ВКЛ) існавала сталая традыцыя замежных падарожжаў, асабліва шматлікімі яны былі сярод магнатаў. Мэты падарожжа былі розныя: рэлігійныя паломніцтвы, дыпламатычныя даручэнні, навучанне ва ўніверсітэтах, знаёмства з дасягненнямі культуры Заходняй Еўропы і г.д. Частка падарожнікаў імкнулася захаваць здабытыя веды і ўражанні для нашчадкаў, таму затаноўвала свае падарожжы на паперы. Захавалася шмат дыярыушаў, напісаных падчас падарожжаў прадстаўнікамі роду Радзівілаў.

Калі аналізаваць падарожжы з рэлігійнымі мэтамі, то адным з самых амбіцыёзных было падарожжа ў Святую зямлю (Іерусалім і яго ваколіцы), якое ў 1582–1584 гг. адбыў Мікалай Крыштаф Радзівіл «Сіротка» (1549–1616). Па выніках сваёй перэгрынацыі ён напісаў і пазней выдаў кнігу, якая карысталася вялікім попытам у яго сучаснікаў [1]. «Перэгрынацыя…» М. К. Радзівіла складаецца з розных нататак, гістарычных экскурсаў і аўтабіяграфічных адступленняў, змяшчае шмат цытат, спасылак на антычныя творы літаратуры і г.д.

Акрамя Іерусаліма, папулярнымі для паломніцтва былі Рым і Сант’яга-дэ-Кампастэла. Італія ўвогуле стала адным з самых папулярных для падарожжа напрамкаў. Захавалася шмат успамінаў з падарожжаў да Апенінскага паўвострава. Напрыклад, лацінамоўны падарожны дыярыуш Юрыя Радзівіла

(1556–1600), напісаны ім у 1575 г. [2], які моцна адрозніваецца ад напісанага Мікалаем Крыштафам Радзівілам. Юрый Радзівіл пісаў дыярыуш штодзённа, гэта невялікія апісанні кожнага дня падарожжа, дзе аўтар змяшчае інфармацыю пра тое, колькі праехаў за дзень, дзе спыніўся на ноч, каго сустрэў.

У 1684–1687 гг. у Еўропе былі браты Караль Станіслаў Радзівіл (1669–1719) і Юрый Юзаф Радзівіл (1668–1689). Браты адправіліся ў Еўропу з мэтай навучання, наведалі практычна ўсе дзяржавы Заходняй і Паўднёвай Еўропы, былі ў Берліне, Празе, Венецыі, Падуе, Вероне, Мілане, Турыне, Ліёне, Арлеане, Версалі, Мадрыдзе, Брусэле, Амстэрдаме і г.д. Акрамя навучання, браты выконвалі дыпламатычныя заданні Яна III Сабескага (1629–1696), былі па яго даручэннях у Лондане і Лісабоне. Частку свайго падарожжа Караль Станіслаў занатаваў у дыярыуш, у якім апісваў маршрут падарожжа і рабіў невялікія запісы палітычнага і краязнаўчага кшталту [3].

Трэба адзначыць, што ў Радзівілаў была сталая традыцыя пісаць дыярыушы не толькі падчас падарожжаў, але і ў сваім паўсядзённым жыцці. Захаваліся дзённікі Альбрыхта Станіслава Радзівіла (1593–1656) [4–6], Януша Радзівіла (1612–1655) [7], Багуслава Радзівіла (1620–1669) [8], Міхаіла Казіміра Радзівіла «Рыбанькі» (1702–1762) [9], Гераніма Фларыяна Радзівіла (1715–1760) [10].

Асаблівае месца ў мемуарнай спадчыне роду Радзівілаў належыць дыярыушу Тэафілі Канстанцыі Мараўскай з Радзівілаў (1738–1818), якая здзейсніла вялікае падарожжа па Еўропе ў 1773–1774 гг. [11]. У сваім дзённіку Тэафіля Канстанцыя паўстае асобай, якая цікавіцца гісторыяй, культурай і побытам розных краін, імкнецца перадаць дынаміку жыцця Заходняй Еўропы.

Падводзячы вынік трэба адзначыць, што мемуарная спадчына роду Радзівілаў багатая, і вялікую яе частку займаюць дзённікі падарожжаў.

### Літаратура

1. Пэрэгрынацыя, або Паломніцтва Ясна Асветленага Князя Ягамосці Мікалая Крыштофа Радзівіла ў Святую Зямлю // Кніга жыцій і хаджэнняў : пер. са старажытнарускай, старабеларускай і польскай / А. Мельнікаў. – Мінск, 1994. – С. 165–447.

2. Radziwiłł, J. Dziennik podróży do Włoch biskupa Jerzego Radziwiłła w 1575 roku / J. Radziwiłł // oprac. H. Barycz / Kwart. Historyczny. – 1935. – № 49. – S. 353–357.

3. Radziwiłł, K. S. Diariusz peregrynacji europejskiej (1684–1687) / K. S. Radziwiłł // oprac. A. Kucharski. – Toruń : Wydaw. Naukowe Uniwersytetu Mikołaja Kopernika, 2011. – 302 s.

4. Радзівіл, А. С. Дыярыюш аб падзеях у Польшчы / А. С. Радзівіл // Спадчына. – 1995. – № 6. – С. 123–170.

5. Радзівіл, А. С. Дыярыюш аб падзеях у Польшчы / А. С. Радзівіл // Спадчына. – 1996. – № 1. – С. 224–259.

6. Радзівіл, А. С. Дыярыюш аб падзеях у Польшчы / А. С. Радзівіл // Спадчына. – 1996. – № 2. – С. 166–204.

7. Korespondencja wojskowa hetmana Janusz Radziwiłła w latach 1646–1655 : 2 cz. / oprac. M. Nagielski [i inni]. – Warszawa, 2019. – cz. 1. Diariusz kancelaryjny 1649–1653. – 2019. – 890 s.

8. Radziwiłł, B. Autobiografia / B. Radziwiłł // oprac. T. Wasilewski [i inni]. – Warszawa : Państwowy Instytut Wydawniczy, 1979. – 379 s.

9. Archiwum Główne Akt Dawnych w Warszawie. – Archiwum Radziwiłłów. Dz. IV. sygn. II–80.

10. Radziwiłł, H. F. Hieronima Floriana Radziwiłła diariusze i pisma różne / H. F. Radziwiłł // oprac. i wstęp M. Brzezina. – Warszawa : Wydawnictwo Energeia, 1998. – 264 s.

11. Morawska, T. K. Diariusz podróży europejskiej w latach 1773–1774 / T. K. Morawska // wstęp i oprac. Bogdan Rok. – Wrocław : Wydaw. Uniwersytetu Wrocławskiego, 2002. – 259 s.

## Роль Центра исследований геноцида и сопротивления жителей Литвы в политике памяти Литовской Республики

*Косяк Н. А., асп. БГУ,*
*науч. рук. проф. Меньковский В. И., д-р ист. наук*

Начиная с 1992 г. в Литовской республике действовал «Государственный центр исследований геноцида жителей Литвы» (ГЦИГЖЛ)[1] [6], занимающийся вопросами памяти. Однако с целью структурирования деятельности центра 1 июля 1993 г. принято решение организовать новую структуру: «Центр исследования геноцида и сопротивления (резистенции) жителей Литвы» [3][2]. Во главе Центра стоит генеральный директор, предлагаемый премьер-министром республики и утверждаемый сеймом республики.

Задачей ЦИГРЖЛ провозглашался поиск доказательной базы преступлений с целью сохранения и увековечения памяти о жертвах, совершенных как немецкой, так и советской военно-политической администрацией с 1939-го по 1991 г. Деятельность центра многофункциональна: систематизация и поиск материалов, раскрывающих факты геноцида; формирование списков жертв геноцида, а также розыск граждан, пропавших без вести в годы

---

[1] Первоочередной задачей центра провозглашалось хранение и исследование архивов спецслужб ЛССР.

[2] Далее ЦИГРЛЖ.